# Літаратуразнаўства

*Т.М.ДАСАЕВА*

## «ЖЫЦЬ ДЛЯ ЛІТАРАТУРЫ»
## (да 85-годдзя з дня нараджэння Івана Мележа)

Осмысливается литературное наследие Ивана Мележа, исследуются истоки его творчества, рассматривается отношение к вопросам писательского мастерства, отмечается самоотверженное служение литературе.

The author contemplates the literary heritage of Ivan Melezh, researches the sources of his creative activity, discusses his attitude to the skills of a writer and pays tribute to his devotion literature.

Ён пражыў толькі 55... Адной «Палескай хронікі» хапіла б, каб Іван Мележ заняў ганаровае месца ў гісторыі беларускай літаратуры XX ст., а ён напісаў яшчэ шмат выдатных твораў - апавяданняў, аповесцей, нарысаў, п'ес, раман «Мінскі напрамак», «Першую кнігу», «Жыццёвыя клопаты». Пералік задуманага і нязздзейсненага не меншы.

Здаецца, столькі напісана пра Івана Мележа, а ён усё яшчэ застаецца да канца не разгаданым, не раскрытым. Кожнае новае пакаленне, якое дакранаецца да творчасці гэтага выдатнага пісьменніка, назаўсёды застаецца ў палоне яго таленту, захапляецца лёсам герояў яго твораў. Ды і сама асоба Мележа, якая паўстае з яго запісных кніжак, дзённікаў, артыкулаў, лістоў, з успамінаў яго сучаснікаў, не перастае прыцягваць увагу сваёй шчырасцю, сумленнасцю, чысцінёй, натхнёнасцю, адкрытасцю, мэтанакіраванасцю, адданасцю літаратуры.

Яго дзённікавыя запісы пададзены то ў форме лірычнай споведзі, то ўсхваляванага маналога, то трывожнага роздуму, то лаканічных памет творчага працэсу. Мележ расказвае пра сябе, раскрывае самае патаемнае, глыбіннае. Шчыры, даверлівы, часам безабаронны, нібы дзіця, у жыццёвых варунках; прынцыповы, палемічны ў пытаннях, якія тычацца літаратуры.

З чаго пачынаўся Мележ-пісьменнік, Мележ-творца, для якога літаратура стала галоўнай мэтай жыцця? Дзеля ажыццяўлення яе былі аддадзены ўсе сілы, падпарадкаваны ўсе імкненні. Мележ разважаў аб вытоках творчасці. У артыкуле «Знайсці сябе» на ўласным прыкладзе ён паказаў, што на шляху да творчасці не бывае дробязей. Тут усё значнае. Ён быў перакананы, што творчасць пачынаецца не з публікацыі першага твора, а значна раней. З нечага няўлоўнага, незаўважанага староннім вокам, усвядомленае толькі самім чалавекам, які яшчэ не ведае, што будзе пісьменнікам, але падсвядома адчувае гэта.

Мележ лічыў, што вытокі яго творчасці пачынаюцца ў дзяцінстве, у простых, здавалася б на першы погляд (зноў жа, для староння вока), з'явах, якія падзеямі і не назавеш. Радасць ад удала прыдуманай і ўхваленай настаўніцай назвы да змешчанага ў буквары малюнка; першае публічнае выступленне (чатыры радкі верша з буквара) у класе, «у які набілася поўна барадатых дзядзькоў у світках, у кажухах, з цыгаркамі» (Мележ 1983, 405). Па прызнанні пісьменніка, усё, што «было потым у гэтым родзе, што здараецца на адказных выступлениях і цяпер, усё было, здаецца, упершыню адчута тады» (Мележ 1983, 405). Там, у маленькай палескай школе, былі перажыты «першыя творчыя

пакуты» (Мележ 1983, 405). Першая прачытаная вялікая кніга «У краіне райскай птушкі» Янкі Маўра і ўсведамленне таго, што кнігі адкрываюць свет, «поўны незвычайнага, дзівоснага» (Мележ 1983, 405). І, нарэшце, жаданне напісаць нешта самому, якое з'явілася вельмі рана. Як успамінаў Мележ, «таміла душу музыка вершаваных сугуччаў, неадчэпна звінелі словы, мелодыі фраз; сэнсу часта не было, але мелодыя была» (Мележ 1983, 406). Незабыўнае, захапляючае пачуццё, калі нешта атрымлівалася: «радок, карціна-вобраз, верш» (Мележ 1983, 406). «Якое вялікае было шчасце, калі тое, амаль няўлоўнае, што таміла цябе, нарэшце пераходзіла ў радкі, вершы! Гэта не інакш была ўжо творчасць, няхай ні для кога не прыкметная, нікому не вядомая, - але яна захоплівала душу!» (Мележ 1983, 406) - з хваляваннем успамінаў Іван Паўлавіч.

Так пачынаўся Мележ-пісьменнік. Але перад усім існавала яшчэ нешта больш важнае, вызначальнае, без чаго не было б тых імгненняў, якія з'яўляліся імпульсам для творчасці. Гэта зямля, на якой нарадзіўся Іван Мележ, вялікая сыноўняя любоў да гэтай зямлі, любоў, якую будучы пісьменнік глыбінна адчуў яшчэ ў маленстве. «Ёсць у кожнага свой мілы сэрцу куток, які з бегам часу не толькі не цьмее ў памяці, а становіцца як бы яснейшы, даражэйшы. Багата можа быць у чалавека за жыццё іншых куткоў, і больш слаўных, і больш выдатных, але гэты куток, і не слаўны, і не выдатны, можа, нічым, не забываецца, не адступае ўдалеч; сярод іншых дарагіх, хвалюючых успамінаў - ён самы дарагі, самы шчымлівы! Куток гэты - тая хата, дзе мы вучыліся хадзіць, дзе чулі цеплыню матчыных рук і матчынага сэрца, куток нашага маленства» (Мележ 1983, 177), - пісаў ён у аўтабіяграфіі «Трохі згадак і думак».

Прызнанне ў любові да роднага Палесся мы знойдзем у многіх мастацкіх і публіцыстычных творах пісьменніка. Любоўю да радзімы, без сумнення, былі б напоўнены і тыя, незавершаныя, што засталіся ў накідах ці яшчэ толькі нараджаліся ў свядомасці аўтара.

Алесь Адамовіч лічыў, што «пісьменнікам Мележа, як і шмат каго, зрабіла вайна. А дакладней - усё, што на той вайне перажыта было, адчута, перадумана, убачана» (Сказ пра Івана Мележа 1984, 5). Не пагадзіцца з гэтым нельга. Сам Мележ вельмі даражыў «Першай кнігай», у якой былі надрукаваны яго ваенныя дзённікі. У прадмове да гэтай кнігі ён пісаў: «Я і цяпер не магу спакойна чытаць гэтыя скупыя радкі, хапатлівыя словы, столькі тояць яны для мяне нявыказанага. Не магу чытаць спакойна, бо бачу не толькі тое, што выказана, але і помню, у якім стане ўсё пісалася. Калі кожны запіс мог аказацца апошнім» (Мележ 1984, 9).

Запіс ад 26 лістапада 1941 г. дакладна перадае, у якіх умовах рабіліся гэтыя запісы: «Пішу. У маленькай магіле-акопе. Цемнавата. Святло працінаецца праз маленькую шчыліну. Цёпла і цесна. Прыціснуўся нагамі да ног кулямётчыка Фядотава. Ён укрыўся і дрэмле, а я пішу, паклаўшы кніжку на калені. Ранішні агляд раблю. У люстэрку - зарослы шчацінай, чорны ад пылу і сажы твар. Няўжо гэта я? Шапка і шынель - у чырвонай гліне. Захлынаючыся, кашляю. Пасля вайны, калі і ўцалею, я, відаць, буду калекай, хворым. Але аб гэтым я нікому не кажу... Фядотаў узняў галаву. «Ты ўсё дзённік? Кінь. Гэтыя дні і так ніколі не забудуцца» (Мележ 1984, 30).

Запаміналася і балела не толькі перажытае ў часе вайны, асабліва на пачатку гэтай «непараўнальнай ні з чым страшнай бядою». «Доўга, балюча гнёў душу разлад паміж нядаўняй лагоднасцю, маладой любоўю да зямлі, да жыцця - і жорсткасцю бамбёжак, страхоццем першых пажараў і першых смерцяў» (Мележ 1983, 182-183), -успамінаў Мележ.

Нясцерпна балела ўбачанае і перажытае пасля вайны. Балела ўсё жыццё. Мележ пісаў аб гэтым у аўтабіяграфіі: «Ніколі не забуду, як я сустрэўся з роднымі мясцінамі неўзабаве пасля вызвалення. Вочы мае бачылі раны такія страшныя і такія свежыя, што хацелася стагнаць, у грудзях увесь час ныла штосьці нясцерпнае, балючае, бясконцае.

Многа пабачыў я за вайну, многае адазвалася болем у сэрцы, але тое, што апякло мяне ў тыя дні, калі зноў убачыўся са спаленай, пачарнелай радзімай сваёй, не параўнаць ні з чым» (Мележ 1983, 177-178).

У першы дзень міру, 10 мая 1945 г., І. Мележа разам з Я. Брылём і П. Кавалёвым прынялі ў Саюз пісьменнікаў БССР. «Прыняты быў без цвёрдых падстаў - больш на падставе спадзяванняў, - у мяне было толькі тры-чатыры апавяданні. Нас было вельмі мала. Нас чакалі з нецярплівасцю, прымалі з радасцю» (Мележ 1983, 368), - успамінаў пісьменнік. Такі давер да многага абавязваў. Мележ адчуваў гэтую адказнасць. У 1946 г. выходзіць яго першы зборнік апавяданняў «У завіруху». У 1948 г. пабачыў свет другі зборнік апавяданняў пад назвай «Гарачы жнівень». У 1947-1952 гг. Мележ працаваў над раманам «Мінскі напрамак», якому шмат аддаў сіл і ў пазнейшы час неаднаразова перапрацоўваў. «Я жыў сваёй кнігай днём і ноччу. Пазней, здаецца, нічога падобнага не было. Можа, усё было так таму, што гэта была першая мая, як мне здавалася, сапраўдная рэч. Першая вялікая любоў, першая надзея. Я вельмі верыў у гэтую кнігу, але яна апраўдала мае надзеі толькі часткова. Яна прынесла мне і радасць, і засмучэнні. Я потым не раз вяртаўся да яе, і чым далей адыходзіў ад яе, тым лепш бачыў свае прамашкі» (Мележ 1983, 413-414), - успамінаў Мележ у артыкуле «Знайсці сябе».

Ён заўсёды быў у пошуку, спасцігаў таямніцы творчасці, паколькі лічыў, што пачаў пісаць «маючы вельмі цьмянае ўяўленне аб літаратурнай справе» (Мележ 1983, 407). Мележ меркаваў, што многія недахопы яго ранніх твораў, у тым ліку і рамана «Мінскі напрамак», звязаны не толькі з нявопытнасцю, але і з тым, што ён іншы раз свядома стрымліваў сябе, адступаў ад лірыка-псіхалагічнай манеры, якая найбольш адпавядала яго светаадчуванню. «Я імкнуўся часта маляваць людзей і карціны знешне, а не знутры, хоць яшчэ пра раннія мае апавяданні вялікі наш пісьменнік Кузьма Чорны сказаў, што па прыродзе сваёй я - псіхолаг... Дарэмна, мне здаецца, я часта стараўся быць спакойным, гнаў усякую пяшчоту, цеплыню... Чаму гэта? Ці не ад жадання быць падобным на некага? Ад недаверу да самога сябе, да сваіх схільнасцей?» - са шкадаваннем адзначаў пісьменнік (Мележ 1983, 414).

Пасля «Мінскага напрамку» ён нібы апынуўся на раздарожжы і некалькі гадоў не пісаў вялікіх твораў. «Гэта быў вельмі важны для мяне час, час пошукаў, роздуму, расчараванняў, самапазнання, - прызнаваўся Мележ. - Я спрабаваў цвяроза ўзважваць усё, што зрабіў да гэтага часу, высветліць прычыны сваіх памылак і промахаў. Можа быць, гэта прыходзіла сталасць...» (Мележ 1983, 415-416). Па словах самога Мележа, адкрываючы простыя ісціны, такія, напрыклад, як «стыль - гэта чалавек», ён пачынае ўсведамляць: «Каб стыль мастака праявіўся больш выразна, своеасабліва, трэба, каб выразна праявілася асоба чалавека, яго светаадчуванне, яго погляды, яго матэрыяльны і духоўны вопыт» (Мележ 1983, 416). Мележ зразумеў, што творца не павінен хаваць сябе, а, наадварот, адкрывацца ва ўсёй шырыні, глыбіні, шчырасці. Быць самім сабой. Гэтыя разважанні прывялі да высновы, што «ўсе загадкі майстэрства залежаць урэшце ад аднаго - ад асобы мастака. Багацце свету, багацце майстэрства пісьменніка - у самой яго асобе. Каб высокае было мастацтва, трэба, каб высокай была асоба творцы» (Мележ 1983, 416). Так складвалася ўяўленне пра тое, як пісаць, уяўленне пра ўласны стыль. Тое, што раней Мележ стрымліваў у сабе, пачынае выяўляцца ў яго новых творах. Апавяданні «Спатканне за горадам» і «У тарах дажджы», якія нібыта падводзілі вынік пошукам пісьменніка, «напісаны ў манеры ўважлівага псіхалагічнага даследавання, з разгорнутымі характарыстыкамі, лірычна афарбаваным пейзажам». «Наогул, лірычны пачатак вельмі шырока ўвайшоў у апавяданні, на гэта я раней не наважваўся» (Мележ 1983, 417), - адзначаў Мележ.

У 1956 г. ён пачаў працу над новай вялікай кнігай-раманам «Людзі на балоце». І толькі цяпер Мележ адчуў, што «трэба пісаць перш за ўсё аб тым, што асабліва дорага душы, што яе хвалявала і хвалюе - што стала дарагой часткай тваёй асабістай біяграфіі» (Мележ 1983, 188). Адчуў і пашкадаваў, што «часам браўся за тое, што не вельмі добра ведаў, браўся, хоць проста не меў права...» (Мележ 1983, 188).

Праца над «Палескай хронікай» прынесла яму адчуванне вялікай радасці творчай працы, свабоду самавыяўлення. Ён усхвалявана пісаў: «Мне амаль нічога не патрэбна было вывучаць, выпытваць, я амаль усё ведаў... Багацце

«матэрыялу» дало мне магчымасць карыстацца ім з рэдкай свабодай. Я шырока бачыў поле, па якім ішоў, адчуваў у ім сябе і работнікам, і гаспадаром. Але, што асабліва важна, поле гэтае я не толькі ведаў, я любіў яго. Таму што поле, па якім я ішоў, тэта было маё поле. Гэта было жыццё блізкіх мне людзей і маё жыццё» (Мележ 1983, 418).

Так мастак знайшоў сваю запаветную тэму, дзе на поўную сілу выявіўся і загучаў яго талент. Захапленне, з якім працаваў Мележ над «Палескай хронікай», не знікала з гадамі, рабіла працу светлай, святочнай. Гэтае адчуванне дало яму падставу для наступнай высновы: «Мне здаецца, што самае важнае ў жыцці пісьменніка - спазнаць, у чым ты моцны, у чым слабы, як ты можаш лепш выказаць сябе, што ты зможаш даць людзям.

Самае важнае - знайсці сваё месца ў жыцці, сваю дарогу, спазнаць, знайсці сябе» (Мележ 1983, 422-423).

Мележ, на жаль, не паспеў завяршыць галоўную кнігу свайго жыцця - «Палескую хроніку». Гэта было сапраўднай трагедыяй для пісьменніка і вялікай стратай для беларускай літаратуры.

Перачытваючы артыкулы Мележа, сабраныя ў кнізе «Жыццёвыя клопаты», якія ў большасці сваёй першапачаткова былі прамовамі на пісьменніцкіх з'ездах, пленумах, пасяджэннях секцыі крытыкі і прозы, разумееш, што на пачатку творчага шляху Мележ невыпадкова хацеў звязаць свой лёс з даследчыцкай працай. Талент даследчыка ў ім відавочны. Уражвае не толькі дасведчанасць Мележа ў галіне літаратуразнаўства, крытыкі, але і смеласць, прынцыповасць пісьменніка, вастрыня яго слова, палемічнасць. Яшчэ ў 50-я гг., калі панавала «тэорыя бесканфліктнасці», ён пачаў адстойваць права на развіццё паўнакроўнай, праўдзівай літаратуры. Асабістым прыкладам сцвярджаў, што ад кожнага пісьменніка залежыць, наколькі паспяхова і хутка будзе адбывацца гэты працэс. Менавіта ў 50-я гг. намеціліся карэнныя зрухі ў літаратурным працэсе, абумоўленыя падзеямі грамадска-палітычнага і літаратурна-арганізацыйнага жыцця: пераадоленне ілюстрацыйнасці, схематызму, бесканфліктнасці, лакіроўкі рэчаіснасці, набліжэнне літаратуры да сапраўднага жыцця. Значная роля ў гэтым належыць Мележу. Паказальна, што яго раман «Людзі на балоце» выйшаў у 1961 г.

Мележ усё жыццё не толькі ўважліва сачыў за літаратурным працэсам, але быў актыўным удзельнікам. Яго хвалявалі «праблемныя пытанні пісьменніцкага майстэрства» (Мележ 1983, 116), стыль, законы эпічных жанраў, разумение сучаснасці літаратурнага твора, праўды мастацтва, народнасці, традыцый і наватарства, развіццё крытыкі, праблемы мастацкага перакладу і многія іншыя.

Ён ніколі не быў абыякавым ні ў асабістым жыцці, ні ў творчым. У яго дзённіку ёсць выказванне Л. Талстога: «Спокойствие -душевная подлость» (гл. Мележ 1984, 322). У запісных кніжках, дзённіках Мележа шмат разважанняў аб літаратуры. Можа таму ён так хацеў выдаць асобнай кнігай свае запісы, каб яго думкі былі даступныя чытачу і сталі прадметам роздуму людзей, зацікаўленых у развіцці нацыянальнай літаратуры. Многія з запісаў Мележа пачынаюцца словам «думаю».

17 сакавіка 1973 г.: «Думаю: пра мяшчанства. Пра тое, як яно шырока распаўзлося, глыбока ўелася каранямі ўсюды, непераможнае і заўсёды задаволенае, заўсёды "мудрае" мяшчанства...» (Мележ 1984, 320).

І далей, з болем: «Бяда, што многія і многія іменна не здольны самастойна і трывожна думаць. Што многім з нас уласціва нейкая незразумелая, дзікая ці што маральная глухата ці санлівасць» (Мележ 1984, 320).

А ён думаў, трывожыўся. 21 студзеня 1976 г. (незадоўга да свайго 55-годдзя): «Думаю (адсюль узрушэнне), што за апошнія 10-15 гадоў адбыліся ў мастацтве перамены, якія нас, літаратараў, не могуць не трывожыць. Калі раней літаратура забірала ў мастацтве 70-80-90 % часу і ўвагі і вызначала ўплыў у мастацтве, то цяпер яна адсунута ўбок, галоўнай "сілай" стала тэлебачанне, якое з'ядае амаль увесь вольны час чалавека... А мы жывём, нібы нічога не здарылася! Нічога не бачым! Балбочам аб дробязях! Хаця трэба біць трывогу. (Дарэчы, безнадзейную! Таму і пагана на душы!.. Пагана яшчэ і таму, што тэлебачанне і кіно нам, беларускай літаратуры, не памочнік і не друг, а магільшчык») (Мележ 1984, 333).

Выказванні Мележа аб літаратуры не страцілі сваёй актуальнасці і сёння. Ён думаў аб будучыні беларускай літаратуры і лічыў, што яе якасны ўзровень у новым, XXI ст., залежыць ад сучасных пісьменнікаў.

Пасля таго, як выйшлі «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы», Мележ усе намаганні скіраваў на напісанне трэцяга рамана. У яго дзённікавых запісах 1969 г. чытаем: «Можа быць, варта прыехаць у Малееўку (ці Перадзелкіна) летам. Тут - ціха. Адгарадзіцца ад усяго і - пісаць, пісаць.

Хадзіць у адзіноце, думаць у адзіноце, тады - к сталу.

Год - і лета - для рамана. Трэба фарсіраваць яго. Канчаць трэба» (Мележ 1984,289).

Ёсць і такі запіс: «Трэба далей:

. 1. Дабіцца водпуску на год - не менш. Ці вызвалення. Прычына - хвароба. Жыць для літаратуры (падкрэслена аўтарам артикула. - *Т. Д.).* Не раскідацца.

2. Рушыць раман.

3. Здароўе. Загартоўвацца да холаду» (Мележ 1984, 291).

Устаноўка, дадзеная самому сабе, азначала: адмаўляцца ад усяго, што перашкаджае творчасці, здзяйсненню задум.

31 кастрычніка 1971 г.: «Увесь час думаю: не пазней лета наступнага года - пайду на творчую працу. Сабраць рэшткі сіл для творчасці, усё - ёй. Раману, які так зацягнуўся» (Мележ 1983, 315).

Нават калі прыйшло рашэнне пакінуць працу ў якасці намесніка старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, ён сумняваўся. Стрымлівала пачуццё асабістай адказнасці. У дзённікавых запісах ад 15 сакавіка 1973 г. ёсць такія словы: «Усе дні ясна. Начамі - месячна. Растае снег. Халоднае паветра. Рэзкія перапады. У мяне - усё баліць. Асабліва - ногі. Часам сэрца. Не магу нічога рабіць. Не пішу.

Нешта вельмі кепска ў мяне. Не ведаю, чым скончыцца і як выбіцца з усяго. Асабліва - з-за службовых абавязкаў.

Становішча ў СП складанае і блытанае. І гэта мяне трымае пры ім. Хтосьці павінен вартаваць здаровае, таленавітае, няцвёрдае.

Нямала давялося для гэтага зрабіць. І цяпер даводзіцца. Але ж як гэта ўскладняе маё становішча» (Мележ 1983, 319-320).

Па дзённікавых запісах Мележа, асабліва датаваных 1974-1976 гг., бачна: ён спяшаўся. Шмат чаго трэба было паспець. Усё было падпарадкавана творчасці, завяршэнню «Палескай хронікі». Акрамя гэтага была яшчэ велізарная грамадская дзейнасць. Ён пераадольваў хваробу, дэпрэсію і працаваў - напружана, мэтанакіравана, самаахвярна. Як ён вытрымліваў? Відаць, дапамагала спрадвечная сялянская цярплівасць, выхаваная ў ім з дзяцінства. А яшчэ пачуццё абавязку (жыць для літаратуры!). У дзённіку Мележа ёсць такое меркаванне: «І ў літаратуры можна цягнуць цяжкі груз на сабе на поўную сілу, а можна крактаць ад натугі, трымаючы за плячыма пусты папяровы мяшок» (Мележ 1984, 322). Ён цягнуў цяжкі воз. Знясільваючая праца для яго, хворага, стомленага чалавека, была нормай. («Лета. Сонца, сіняе неба. Людзі бадзяюцца па лесе, песцяцца на моры. А я - як катаржнік - аўтарызую на дачы...» (Мележ 1982, 282)).

Усё часцей адольвалі адчай, безвыходнасць. 16 верасня 1975 г. Мележ запісаў у дзённіку: «Відаць, так і застанецца недапісанай мая абяцаная "Палеская хроніка". Гэты раман я, можа, як-небудзь са скрыпам дацягну. А як тое, што ляжыць у папцы. Тое, якое магло б даць "Хронiцы" выгляд хоць нейкай завершанасці.

Нічога не радуе. Ды і бедавання няма. Не магу і бедаваць. Абыякавасць. Нават пра тое, што працягну нядоўга, думаю абыякава. А між тым - жыццё ідзе. Ідуць розныя паперы, запрашэнні - на сходы, на сімпозіумы, у Мінск, у іншыя гарады» (Мележ 1984, 331).

Адначасна з працай па завяршэнні «Палескай хронікі» выспявалі новыя творчыя задумы. Гэта радавала і засмучала. «Адламала галіну, на якой поўна зялёных яблык. Я як тая галіна. Поўна ва мне задум, якія прападуць са мною» (Мележ 1984, 330), - з горыччу пісаў Мележ. Паводле дзённікавых запісаў вядома, што ён збіраўся напісаць раман «Горад» (пра сучасны Мінск, яго людзей), апавяданне «Дастоева», стварыць літаратурныя партрэты Я. Брыля і У. Кра-

чанкі, напісаць у жанры апавядання ці аповесці творы «Чырвоны ліман» (вайна, пасляваенная рэчаіснасць), «Намеснік» (на вясковым матэрыяле), «Паход» (аўтабіяграфічны твор пра службу ў арміі напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны), планаваў напісаць пра ахвяры вайны, пра сучасную сям'ю і многае іншае.

Асаблівае месца займалі задумы твораў, звязаных з роднымі мясцінамі, успамінамі пра маленства. Сярод іх - «Лепшыя гады». «Пісаць, як пра лепшае. Як пра самую вялікую радасць. Уся рэч - павінна быць прасякнута шчасцем жыцця» (Мележ 1984, 297), - пазначана ў накідах да гэтага твора. Марыў напісаць твор «Апошняя паездка» («Вяртанне») - пра чалавека, лёс якога падобны да лёсу аўтара - «паранены, хворы, якому ўжо мала засталося, адчувае - апошні раз вяртаецца ў родную вёску, у свет маленства, мар» (Мележ 1984, 326-329). Мележ марыў напісаць яшчэ адзін запаветны твор «Маленства ў Глінішчах (Сентыментальнае падарожжа пажылога чалавека)». У накідах да яго, якія кранаюць шчымлівай спавядальнай інтанацыяй, лірызмам, ёсць словы: «Няхай кніга гэта будзе, як паэма. Усхваляваная, поўная сардэчнага трапятання, смутку і радасці. Песня-паэма. І няхай - за ўсім чуецца немалады чалавек, які многа перажыў і многа падумаў. І які глядзіць туды, у далеч гадоў, з удзячнасцю і тугою» (Мележ 1984, 335).

Ён пражыў толькі 55...

У дзень свайго нараджэння, 8 лютага 1976 г., Мележ запісаў у дзённіку: «Мне пяцьдзесят пяць. Калі б не здароўе, то можна было б лічыць сябе ў цэлым больш-менш шчаслівым. Але здароўя няма. І свята няма. Гляджу ўперад без радасці» (Мележ 1984, 234).

І ўсё ж радасць была. У 1976 г. у часопісе «Полымя» (№ 3, 4, 5) публікуецца трэці раман «Палескай хронікі» - «Завеі, снежань», у маі - чэрвені гэтага ж года ў часопісе «Маладосць» друкуецца «Першая кніга». У красавіку адбыўся аўтарскі вечар І. Мележа. 11-12 мая ён выступав на VII з'ездзе пісьменнікаў БССР. Адразу пасля з'езда па запрашэнню П.М. Машэрава разам з групай беларускіх пісьменнікаў падарожнічае па Палессі. Выступав ў Жыткавічах, Тураве на літаратурных вечарах. Наведвае родную вёску і школу (гл. Мележ 1985, 482). 21-26 чэрвеня ўдзельнічаў у рабоце VI з'езда пісьменнікаў СССР. Да апошніх дзён (ён пайшоў з жыцця 9 жніўня 1976 г.) Мележ працаваў. Жыў для літаратуры.

Сімвалічна, што 85-годдзе з дня нараджэння Івана Мележа супадае з 85-годдзем з дня ўтварэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Ваенныя дарогі прывялі ў свой час маладога Івана Мележа на ст. Сходня (пад Масквой), куды перамясціўся з акупанаванай тэрыторыі і ў 1943 г. узнавіў заняткі БДУ. У 1943-1944 гг. ён выкладаў тут ваенную падрыхтоўку. У жніўні разам з універсітэтам пераехаў у Мінск. Завочна вучыўся на філалагічным факультэце, які закончыў у 1945 г. У 1945-1948 гг. вучыўся ў аспірантуры пры БДУ, пісаў даследаванне па творчасці Кузьмы Чорнага. Пасля заканчэння аспірантуры два гады працаваў выкладчыкам беларускай літаратуры ў БДУ.

І яшчэ некалькі фактаў. У гэтым годзе спаўняецца 30 гадоў з дня смерці Мележа; 45 гадоў з дня апублікавання ў часопісе «Полымя» рамана «Людзі на балоце»; 50 гадоў з таго часу, як Мележ пачаў працаваць над гэтым раманам; 60 гадоў з дня выхаду ў свет першага зборніка апавяданняў «У завіруху».

Народны пісьменнік Беларусі Іван Паўлавіч Мележ з намі, у XXI стагоддзі. Яго творы не страцілі цікавасці ў чытача, яны сугучныя нашаму часу.

ЛІТАРАТУРА

Мележ І. Зб. тв.: У 10 т. Т. 8. Жыццёвыя клопаты: Артыкулы, эсэ, інтэрв'ю. Мн., 1983; Т. 9. Першая кніга. Дзённікі, запісныя кніжкі Мн., 1984; Т. 10. Эпісталярная спадчына (1945-1976). Летапіс жыцця і творчасці. Мн., 1985.

Сказ пра Івана Мележа. Мн., 1984.

Паступіў у рэдакцыю 21.03.06.

***Таццяна Мікалаеўна Дасаева*** - доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры.